ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 001.32(476):[1/3+7/9]:001.89
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-1-7-14

Паступіў у рэдакцыю 29.11.2024
Received 29.11.2024

**А. А. Каваленя, В. І. Ляўковіч, В. С. Юшкевіч**

*Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ДАСЯГНЕННІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ АКАДЭМІЧНАЙ ГУМАНІТАРЫСТЫКІ

**Аннотация.** Анализируются достижения ученых Отделения гуманитарных наук и искусств Национальной академии наук Беларуси за период 2021–2024 гг. Отмечаются наиболее крупные результаты и опубликованные фундаментальные труды, раскрывающие богатейший историко-культурный и духовный потенциал белорусского народа и не имеющие аналогов за рубежом. Показаны место и роль социально-гуманитарных наук в белорусском обществе. Подчеркивается, что главными задачами исследований ученых-гуманитариев являются аргументированное отстаивание исторической правомерности белорусской государственности и национально-государственных интересов Республики Беларусь в мировом сообществе, сохранение духовных и материальных историко-культурных ценностей белорусского народа, укрепление международного престижа страны и белорусской гуманитарной науки. Обозначены перспективные направления научных исследований в социально-гуманитарных науках.

**Ключевые слова:** социально-гуманитарные науки, общество, государственность, гуманитарная безопасность, развитие

**Для цитирования:** Каваленя, А. А. Дасягненні і перспектывы развіцця акадэмічнай гуманітарыстыкі / А. А. Каваленя, В. І. Ляўковіч, В. С. Юшкевіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2025. – Т. 70, № 1. – С. 7–14. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-1-7-14

**Aliaksandr A. Kavalenia, Vasili I. Liaukovich, Volha S. Yushkevich**

*Department of Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## ACHIEVEMENTS AND PROSPECTS OF ACADEMIC HUMANITARIAN SCIENCE DEVELOPMENT

**Abstract.** The article analyzes the results and achievements of scholars the Department of Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus in 2021–2024. The work denotes unparalleled and the most important fundamental studies that reveal rich historical, cultural and spiritual heritage of Belarusian people. Authors also show the place and the role of social and humanitarian sciences in Belarusian society.

The work stresses that the main objective of the research of scholars-humanists is not only the defence of the historical legitimacy of the Belarusian statehood and national-state interests of the Republic of Belarus in the world community, but also the preservation of the spiritual, material, historical and cultural values of Belarusian people and the strengthening of both: the country's international prestige and Belarusian humanitarian science.

And finally, the paper presents quantitative results of the research and the most significant practical achievements of scholars accomplished in the recent years. Promising directions of scientific research in the social and humanitarian sciences are outlined.

**Keywords:** humanities and social sciences, society, statehood, humanitarian security, development

**For citation:** Kavalenia A. A., Liaukovich V. I., Yushkevich V. S. Achievements and prospects of academic humanitarian science development. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2025, vol. 70, no. 1, pp. 7–14 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-1-7-14

**Уводзіны.** Беларускі народ у працэсе гістарычнага развіцця выпрацаваў пэўную сістэму ідэй, уяўленняў, паняццяў і прынцыпаў фарміравання сваёй нацыянальнай супольнасці, форм дзяржаўнага, эканамічнага і духоўна-культурнага ладу жыцця, узаемаадносін з іншымі народамі. Гэтыя ідэі і ўяўленні, захаваныя ў народных традыцыях і свядомасці народа, абагульняюцца ў навуковых працах, мастацкіх творах, праграмах палітычных партый і грамадскіх рухаў, замацоўваюцца ў Канстытуцыі, дакументах стратэгічнага характару і складаюць аснову пабудовы народам дзяржавы.

Гуманітарная навука заклікана служыць кансалідацыі грамадства, пошуку навукова абгрунтаваных шляхоў пераадолення крызісаў духоўнасці, развіццю гістарычнай свядомасці людзей, гарманізацыі грамадска-вытворчых адносін, умацаванню беларускай дзяржаўнасці і бяспекі.

© Каваленя А. А., Ляўковіч В. І., Юшкевіч В. С., 2025

Ва ўмовах абвастрэння геапалітычнага становішча і ўзмацнення санкцыйнага ціску на фоне актыўнага распаўсюджання з дапамогай сучасных медыя, лічбавых тэхналогій феноменаў масавай культуры і іх негатыўнага ўплыву на насельніцтва актуалізуецца запыт на пошук фундаментальных падстаў, якія спрыяюць захаванню і перадачы наступным пакаленням унікальнасці беларускай нацыянальнай гісторыі, культуры, мовы, літаратуры.

Развіццё галін сацыяльна-эканамічнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь – галоўны прыярытэт эканамічнай палітыкі нашай дзяржавы. Адукацыя разам з навукай і інфарматызацыяй грамадства – важнейшы стратэгічны рэсурс паспяховага развіцця дзяржавы, паколькі менавіта чалавечы патэнцыял забяспечвае поспех усіх эканамічных, палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў у краіне.

У беларускай гуманітарнай навуцы назапашаны значны вопыт аналізу і прагназавання трансфармацыйных зрухаў, якія адбываліся ў палітычнай, духоўна-культурнай, сацыяльна-эканамічнай сферах беларускага грамадства ў кантэксце агульнасусветных тэндэнцый і працэсаў. У працах акадэмічных даследчыкаў мінулых гадоў з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый раскрываюцца гістарычны вопыт і дасягненні беларускага народа.

За апошні час вучоныя-гуманітарыі падрыхтавалі і выдалі шэраг буйных фундаментальных прац, у якіх навукова абгрунтавана адстойваецца гісторыя духоўна-культурнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускага народа. На шматлікіх прыкладах раскрыты станаўленне і развіццё нацыянальнай дзяржаўнасці, здабыццё суверэнітэту і адстойванне бяспекі краіны.

У артыкуле ставіцца задача паказаць вынікі навукова-даследчай работы і найбольш значныя дасягненні калектыву вучоных Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за 2021–2024 гг. і акрэсліць перспектыўныя напрамкі навуковых даследаванняў у сацыяльнай сферы[1].

**Найважнейшыя вынікі выканання дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы” на 2021–2025 гг.** Названая дзяржаўная праграма навуковых даследаванняў змяшчае восем падпраграм.

Інстытут гісторыі НАН Беларусі, які ў 2024 г. адзначыў 95-гадовы юбілей, з’яўляецца першай галаўной арганізацыяй дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў, а таксама каардынуе навуковыя даследаванні ў галіне археалогіі, антрапалогіі, гісторыі.

За апошнія чатыры гады[2] вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі падрыхтавана і выдадзена 115 кніжных выданняў (манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, матэрыялаў канферэнцый), 1076 навуковых артыкулаў, 183 тэзісы, арганізаваны шэраг навукова-практычных мерапрыемстваў (канферэнцый, круглых сталоў, навукова-практычных семінараў, прэзентацый), у тым ліку ў рэгіёнах нашай краіны: Лідзе, Сянно, Талачыне, Дзятлаве і інш.

У Інстытуце гісторыі ўпершыню быў створаны і актыўна развіваецца навуковы напрамак “Беларусь скрозь прызму рэгіянальнай гісторыі”. На сённяшні дзень апублікавана каля 30 кніг гэтай серыі. У выніку інфармацыя па гісторыі рэгіёнаў і буйных населеных пунктаў становіцца даступнай шырокаму колу людзей. Набываюць папулярнасць курсы па гістарычным краязнаўстве і спецкурсы па гісторыі свайго населенага пункта ці рэгіёна ў навучальных установах розных узроўняў. Актуальнасць праблемы рэгіянальнай гісторыі вызначаецца патрэбамі дзяржаўнага будаўніцтва, развіцця гістарычнай навукі, рэалізацыяй праграм культурнага, ідэалагічнага і патрыятычнага выхавання. Выданне падобных прац садзейнічае не толькі глыбокаму вывучэнню асобных гістарычных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь, ролі асобы ў гісторыі, практычнай накіраванасці гістарычных традыцый, але і фарміраванню грамадзянскіх пачуццяў у падрастаючага пакалення. За цыкл прац “Беларусь скрозь прызму рэгіянальнай гісторыі” вучоныя Інстытута

[1] Больш поўна вынікі выканання заданняў у межах падпраграм дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы” на 2021–2025 гг. адлюстраваны ў манаграфіі “Акадэмічная гуманітарыстыка”, якая рыхтуецца штогод вучонымі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [1–3].

[2] Тут і далей вынікі за 2024 г. змяшчаюць лічбавыя даныя выканання падпраграм дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы” на 2021–2025 гг. за першае паўгоддзе.

гісторыі НАН Беларусі В. Л. Лакіза, А. В. Бараноўскі і А. Б. Доўнар удастоены прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за 2023 г.

Упершыню праведзена буйнамаштабнае сістэмнае даследаванне археалагічнага комплексу на р. Менцы (у в. Гарадзішча Мінскага р-на). Выяўлены і даследаваны ўнікальныя археалагічныя матэрыялы X–XI стст.: каменныя, шкляныя, металічныя і керамічныя вырабы; бярвенні абарончых збудаванняў, у тым ліку з антрапаморфнай выявай (у дрэва ўрэзана сківіца дзіка). Гэта распрацоўка ўвайшла ў Топ-10 вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў у 2023 г.

Акадэмічныя гісторыкі выявілі новую дату засялення тэрыторыі Беларусі. Калі раней лічылася, што першыя людзі з’явіліся на беларускіх землях 100–40 тыс. гадоў назад, то сёння матэрыялы археалагічных даследаванняў сведчаць пра тое, што засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі адбывалася не менш як 400 тыс. гадоў назад.

Вучоныя Інстытута гісторыі аказваюць вялікую дапамогу супрацоўнікам Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь у расследаванні крымінальнай справы генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У выніку праведзенай работы ўдакладнены звесткі пра колькасць пацярпелых населеных пунктаў (па стане на 30 ліпеня 2024 г. іх колькасць складае не менш як 12 348, у той час як раней лічылася 9200 вёсак, у тым ліку не менш як 288 населеных пунктаў падзялілі лёс Хатыні, а па ранейшых звестках – 186 вёсак).

У Інстытуце гісторыі разгорнута плённая праца ў межах Усебеларускай акцыі “Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх!”. У выніку выдадзены чатыры кнігі серыі, створана электронная база даных. Гэта акцыя была ініцыявана Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і сёння аб’яднала прафесійных гісторыкаў, выкладчыкаў устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў, студэнцкую і вучнёўскую моладзь. З мэтай выканання даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2022 г. № 18/205-489 П711 аб стварэнні інфармацыйнага інтэрнэт-партала з мэтай медыйнага суправаджэння Усебеларускай акцыі “Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх!” Інстытутам гісторыі распрацаваны і функцыянуе інтэрактыўны навукова-інфармацыйны партал “Летапіс – памяць беларускага народа” [4].

Цікавыя і грамадска значныя даследаванні ажыццяўляюць вучоныя Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, які каардынуе навуковыя даследаванні па этналогіі, мастацтвазнаўстве, фалькларыстыцы, мовазнаўстве, літаратуразнаўстве.

У 2021–2024 гг. вучонымі цэнтра апублікавана 154 кніжныя выданні, 1473 навуковыя артыкулы, 61 тэзіс.

Завершана праца над унікальным дзесяцітомным навуковым энцыклапедычным выданнем “Гарады і вёскі Беларусі. Энцыклапедыя” [5], у якім упершыню ў айчыннай навуцы на падставе вывучэння шматлікіх архіўных і бібліяграфічных крыніц адлюстраваны асноўныя звесткі пра гістарычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё ўсіх населеных пунктаў Беларусі з часу іх заснавання да нашых дзён. У 2022 г. выданне ўдастоена прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” за значны ўклад у выхаванне любові да Айчыны, даследаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

Лаўрэатамі прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2022 г. у галіне гуманітарных і сацыяльных навук за комплекс прац “Народна-паэтычная спадчына як крыніца развіцця маральнай свядомасці і патрыятызму” сталі акадэмік А. І. Лакотка, А. Г. Алфёрава і Т. І. Кухаронак. Серыя складаецца з пяці выданняў, якія змяшчаюць яскравыя і самабытныя тэксты беларускага фальклору. У іх заключаны тыя агульначалавечыя каштоўнасці, што маюць важнае і спрадвечнае значэнне для інтэграцыі ўнікальных помнікаў беларускай народнай творчасці ў сусветны культурны кантэкст.

Значныя творчыя дасягненні маюць акадэмічныя філолагі.

У 2024 г. 95-гадовы юбілей адзначыў Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа. Акадэмічнымі лінгвістамі ажыццяўляецца вялікая праца па вывучэнні сучаснага стану і гістарычнага развіцця беларускай літаратурнай мовы, беларускіх народных гаворак, а таксама ўзаемасувязей беларускай мовы з іншымі славянскімі і неславянскімі мовамі.

Навуковая грамадскасць станоўча ацаніла выданне “Гістарычны слоўнік беларускай мовы: інфармацыйна-даведачны выпуск” [6], у якім абагульнены вынікі амаль шасцідзесяцігадовай навуковай дзейнасці некалькіх пакаленняў супрацоўнікаў аддзела гісторыі беларускай мовы па стварэнні “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы” [7].

Патрэбна адзначыць важную не толькі для айчыннай, але і для сусветнай навукі падзею – стварэнне Нацыянальнага корпуса электронных тэкстаў беларускай мовы аб’ёмам 1 млрд словаўжыванняў, які ўключае тэксты беларускай мовы пачынаючы з XVI ст. па сённяшні дзень (змяшчае поўны корпус тэкстаў Біблії Ф. Скарыны, корпус тэкстаў XIX ст., корпус тэкстаў XX ст., корпус беларускіх дыялектных тэкстаў і інш.). Падрыхтавана Граматычная база беларускай мовы на 266 000 парадыгм (анлайн- і CD-версіі), якая з’яўляецца адным з найбуйнейшых у цяперашні час слоўнікаў беларускай мовы, уваходзіць у лік 30 найбуйнейшых слоўнікаў свету.

Апублікавана выданне “Русско-белорусский системный семантический словарь” [8], у якім упершыню паказаны міжмоўныя суадносіны рускіх і беларускіх лексічных адпаведнікаў, якія ўваходзяць на падставе агульнай семантычнай прыметы ў лексіка-семантычныя палі геаграфічнага ландшафту, руху без перамяшчэння, гуку, перамяшчэння ў прасторы, надвор’я, маўлення, колеру, эмоцый. Члены аўтарскага калектыву А. Г. Ванкевіч, І. У. Кандраценя і В. М. Нікалаева сталі лаўрэатамі прэміі “Зоркі Садружнасці” ў намінацыі “За выдатны ўклад і дасягненні ў галіне навукі і адукацыі” ў 2023 г.

Навуковая грамадскаць, выкладчыкі ВНУ і настаўнікі з цікавасцю сустрэлі комплекс нарматыўных даведнікаў “Слоўнік беларускай мовы” [9] і “Граматычны слоўнік дзеяслова” [10], якія найбольш поўна і маштабна адлюстроўваюць сучасны стан норм беларускай літаратурнай мовы. Падрыхтавана і надрукавана комплексная навукова-інтэрпрэтацыйная і даведачна-інфармацыйная праца “Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: аналітычныя і даведачна-інфармацыйныя матэрыялы” [11], якая з’яўляецца істотным укладам у тэорыю і практыку лінгвагеаграфічных даследаванняў.

З мэтай павышэння прэстыжу краіны і прадстаўленасці беларускай мовы на сайце Еўразійскай эканамічнай камісіі супрацоўнікі Інстытута мовазнаўства ажыццявілі пераклад на беларускую мову больш за 3 тыс. дакументаў.

Значныя творчыя дасягненні маюць вучоныя-літаратуразнаўцы. За гады выканання заданняў падпраграмы “Беларуская мова і літаратура” яны распрацавалі метадалагічныя асновы аналізу структурных кампанентаў літаратурнага твора як цэласнай і дынамічнай мастацкай сістэмы; асэнсавалі працэс станаўлення аўтарскай самасвядомасці ў беларускім пісьменстве эпохі Рэнесансу і барока. Праведзена даследаванне паэтыкі і эстэтычнай канцэпцыі аўтараў пачатку XX ст. (класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас), другой паловы XX ст. і сучаснага літаратурнага працэсу.

Упершыню праведзена комплекснае навукова-тэксталагічнае даследаванне твораў Кузьмы Чорнага. У тэкстах апавяданняў адроджаны стыль аўтара, ліквідаваны недакладнасці папярэдніх выданняў. На сённяшні дзень знаходзіцца ў друку трэці том Збору твораў Кузьмы Чорнага ў 12 тамах.

Вынікі даследавання ўжо выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы даследчыкаў літаратуры, настаўнікаў-філолагаў і літаратурных рэдактараў.

Значную грамадска важную навукова-даследчую працу выконваюць вучоныя Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі. За апошнія чатыры гады імі падрыхтавана 15 кніжных выданняў, 302 навуковыя артыкулы, 453 тэзісы.

Істотным дасягненнем стала распрацоўка сацыялагічнай мадэлі эканамічных паводзін сацыяльнага суб’екта ва ўмовах лічбавізацыі і метадалогіі комплекснага даследавання сацыяльных аспектаў лічбавай трансфармацыі эканомікі. Вызначаны асноўныя паказчыкі паспяховай адаптацыі насельніцтва да лічбавага асяроддзя Рэспублікі Беларусь; прапанавана методыка разліку комплекснага паказчыка лічбавай кампетэнтнасці насельніцтва Беларусі.

У рамках сацыякультурнага падыходу выяўлены тэхналагічная, сацыяльна-псіхалагічная і культуралагічная логікі трактоўкі лічбавізацыі, якія дазваляюць разглядаць апошнюю як полісемантычны феномен, што патрабуе комплекснай сацыялагічнай метадалогіі аналізу. Распрацоўка адлюстравана ў манаграфіі “Социокультурные практики населения Беларуси в условиях цифровой трансформации” [12].

Практычныя вынікі эмпірычных сацыялагічных даследаванняў былі адлюстраваны ў 87 аналітычных матэрыялах, якія былі накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і ў іншыя органы дзяржаўнага кіравання.

Плённа працуюць вучоныя Інстытута філасофіі НАН Беларусі. За апошнія чатыры гады імі падрыхтавана 62 кніжныя выданні, 758 навуковых артыкулаў, 387 тэзісаў дакладаў.

Намаганнямі акадэмічных філосафаў упершыню ў айчыннай навуцы створана сістэма беларускай этнафіласофіі. Распрацоўка ўвайшла ў Топ-10 вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў 2021 г. Яна адлюстравана ў шэрагу кніжных выданняў. Калектыўная манаграфія “Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія” [13] запатрабавана ў беларускім грамадстве і вытрымала трэцяе выданне. Апублікаваны тры з пяці ілюстраваных кніг серыі “Традыцыйны светалад беларусаў” на трох мовах (“Кніга 1. Касмалогія” [14], “Кніга 2. Сфера сакральнага. Народная тэалогія” [15], “Кніга 3. Чалавек” [16]), якія раскрываюць традыцыйныя ўяўленні беларусаў пра светабудову і жыццёвую прастору, шматмернасць сакральнага досведу.

Варта адзначыць той факт, што даследчыкі Інстытута філасофіі ажыццявілі падрыхтоўку чатырох тамоў шасцітомнага выдання “Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі” [17], у якім прадстаўлена ўнікальная ў гуманітарнай навуцы панарамная карціна гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Вядзецца навукова-даследчая праца па падрыхтоўцы шматтомных выданняў “История эстетической мысли Беларуси”, “Антология белорусской философской мысли”. Вядучыя вучоныя-філосафы актыўна выступаюць у СМІ, пастаянна арганізуюць тыдні філасофіі, папулярызуючы філасофскую спадчыну і інтэлектуальную культуру Беларусі.

Пад пільнай увагай вучоных-эканамістаў знаходзяцца сацыяльна-эканамічныя працэсы дзяржавы. Вучоныя Інстытута эканомікі НАН Беларусі за 2021–2024 гг. апублікавалі 91 кніжнае выданне, 865 навуковых артыкулаў, 526 тэзісаў.

Намаганнямі вучоных-эканамістаў распрацаваны тэорыя і метадалогія найноўшай палітэканоміі; канцэптуальныя падыходы па ўдасканаленні інструментарыю грашова-крэдытнага рэгулявання ва ўмовах знешніх шокаў і негатыўных паводзінскіх эфектаў; практычныя рэкамендацыі па рэгуляванні абарачэння віртуальных валют у беларускай эканоміцы.

Дзякуючы супрацоўніцтву вучоных Інстытута эканомікі НАН Беларусі і Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь выконваецца праца па абагульненні і падрыхтоўцы аналітычных матэрыялаў, прапаноў па павышэнні эфектыўнасці рашэння ключавых задач па захаванні эканамічнай бяспекі і стымуляванні сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Сёння ў Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі актывізавана навукова-інфармацыйная дзейнасць. У 2021 г. у складзе Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі створаны Цэнтр энцыклапедычных выданняў. Значнай падзеяй для вучоных Аддзялення стала аднаўленне нацыянальнай энцыклапедыі. Гэта важны сімвал краіны, магутны сродак фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і светапоглядных установак, эфектыўны інструмент уплыву на грамадскую свядомасць. Асноўная задача цэнтра – навукова-даследчая праца ў галіне стварэння электронных мультымедыйных анлайн-рэсурсаў і рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць па падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў у электронным фармаце з мэтай аб’ектыўнай падачы інфармацыі па гісторыі і сучаснасці Беларусі.

Партал “Беларуская энцыклапедыя” [18] распрацаваны на аснове вывучэння вопыту замежных электронных энцыклапедый, сучасных падыходаў да падачы энцыклапедычнага матэрыялу, функцыяналу старонак, дызайну сайта, артыкулаў і ілюстрацый.

**Перспектыўныя напрамкі развіцця навуковых даследаванняў арганізацый Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.** Вядома, што не ўсе праблемы сучаснай гуманітарыстыкі асвятляюцца дастаткова поўна і аб’ектыўна. Перад даследчыкамі гуманітарных ведаў паўстаюць пытанні паглыбленага асэнсавання не толькі мінулага, але і сучаснага грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага жыцця беларускага народа.

Неабходна прадоўжыць комплекснае аб’ектыўнае навуковае даследаванне гісторыі Беларусі ад старажытнасці да сучаснасці, гісторыі і тэорыі беларускай дзяржаўнасці, працэсу станаўлення беларускай нацыі і развіцця яе культуры, а таксама захавання і ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці ў кантэксце сучасных выклікаў і глабальных інтэграцыйных працэсаў. Асэнсаванне нацыянальнага гістарычнага вопыту – гэта важнейшая духоўна-светапоглядная крыніца развіцця грамадства, фарміравання грамадзянскіх і патрыятычных якасцей падрастаючага пакалення. Гуманітарная навука заклікана не толькі забяспечыць перадачу навуковых ведаў і ідэй новым пакаленням, але і сфарміраваць іх каштоўнасныя арыентацыі, перш за ўсё ў маральным вымярэнні.

Уяўляюцца актуальнымі комплексныя археалагічныя даследаванні помнікаў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў межах выканання “Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі канцэпцыі фарміравання і рэалізацыі найбольш значных нацыянальных археалагічных праектаў”, сярод якіх – “Археалагічная карта Беларусі”.

Варта засяродзіць увагу на комплексным вывучэнні дынамікі і нацыянальнай спецыфікі культуры беларусаў і этнічных груп у Рэспубліцы Беларусь, а таксама беларускага фальклору ў яго жанравай, дыялектнай і функцыянальнай разнастайнасці ў кантэксце захавання гуманітарнай бяспекі дзяржавы і кансалідацыі грамадства.

З мэтай забеспячэння патрэб сучаснай моўнай практыкі неабходна прадоўжыць вывучэнне эвалюцыі і сучаснага стану беларускай мовы як нацыянальнай, а таксама яе дыялектаў на розных узроўнях і падрыхтаваць шэраг слоўнікаў, найперш поўны тлумачальны слоўнік сучаснай беларускай мовы.

Варта актывізаваць літаратуразнаўчыя даследаванні. Тэорыя і гісторыя літаратуры, кампаратывістыка, тэксталогія і выданні класікаў – гэта грунт, на якім забяспечваецца развіццё нацыянальнай літаратуразнаўчай навукі краіны. Неабходна засяродзіць увагу на комплексным даследаванні мастацкіх дасягненняў і тэндэнцый развіцця беларускай літаратуры, якія садзейнічаюць умацаванню інфармацыйнай бяспекі краіны; а таксама прадоўжыць працу па тэксталагічнай падрыхтоўцы і выданні збораў твораў класікаў беларускай літаратуры, найперш Кузьмы Чорнага.

Інтэгруючая мэта навуковых даследаванняў акадэмічных філосафаў заключаецца ў пабудове цэласнай карціны асаблівасцей, адметных рыс і базісных прынцыпаў развіцця беларускага грамадства на сучасным этапе глабальных сацыякультурных змен і тэхналагічных інавацый. Сёння архіважна выпрацаваць навуковыя падыходы сістэмы дзейсных сродкаў па ўмацаванні інтэлектуальнага і духоўна-маральнага патэнцыялу нацыі, каб эфектыўна процістаяць выяўленым рызыкам і пагрозам у кантэксце захавання гуманітарнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Актуальным застаецца вывучэнне этыка-эстэтычных і сацыякультурных умоў і фактараў умацавання інтэлектуальнага і духоўна-маральнага патэнцыялу беларускага грамадства, грамадзянска-патрыятычнай матывацыі, гарманізацыі грамадскіх адносін, сувязей паміж пакаленнямі, міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды і ўзаемаразумення.

Рэспубліка Беларусь – суверэнная незалежная дзяржава, паўнапраўны член сусветнай гаспадарчай сістэмы, таму ўлік сусветных трэндаў як новай глабальнай рэальнасці з’яўляецца неабходнай умовай для распрацоўкі эканамічнай палітыкі на 2025–2030 гг. Мэтазгодна вывучыць тэарэтычныя асновы збалансаванага развіцця, асноўныя сусветныя тэндэнцыі і рызыкі, правесці аналіз макраэканамічных індыкатараў Рэспублікі Беларусь ва ўмовах новых выклікаў і пагроз, падрыхтаваць навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі па забеспячэнні збалансаванага эканамічнага развіцця і нацыянальнай бяспекі краіны.

Узмацненне ролі інфармацыйных тэхналогій у рэалізацыі правоў і свабод грамадзян выклікае неабходнасць распрацоўкі і абгрунтавання мер супрацьдзеяння негатыўным сацыяльным з’явам. Запатрабаваны даследаванні смарт-кантрактаў, крыптавалюты, блокчэйна, штучнага інтэлекту, нейрасетак і аб’ектаў робататэхнікі ў якасці элементаў грамадзянскіх адносін.

Важна ўдасканальваць метады сацыялагічных даследаванняў сучаснага развіцця грамадства. Навуковы сацыялагічны падыход дае магчымасць дапоўніць тэхналагізатарскае бачанне працэсаў развіцця інфармацыйных тэхналогій і лічбавізацыі ўсіх сфер грамадства гуманістычнай перспектывай, зваротнай сувяззю з сацыяльнымі суб’ектамі, сінхранізаваць тэхналагічныя, эканамічныя і сацыяльныя працэсы, выявіць праблемныя аспекты і сегменты няўзгодненасці, даць

органам кіравання інфармацыю, якая не може быць атрымана метадамі афіцыйнай статыстыкі. Актуальным уяўляецца сацыялагічнае даследаванне беларускага грамадства з мэтай забеспячэння сацыяльнага дабрабыту насельніцтва, грамадзянскіх ініцыятыў і адказнасці ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства, сацыяльнай напружанасці і нестабільнасці.

Неабходна прапанаваць механізмы эфектыўнай рэалізацыі ў дзяржаўнай сацыяльнай палітыцы базавых прынцыпаў сацыяльна арыентаванай эканомікі, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, дэмакратычнай і прававой дзяржавы, мясцовага самакіравання і іншых інстытутаў грамадзянскай супольнасці.

Ва ўмовах знешніх выклікаў і санкцыйнага ціску перспектыўным з'яўляецца даследаванне рэсурснага патэнцыялу культурнага капіталу рэгіёнаў Беларусі і магчымасці яго выкарыстання ў развіцці нацыянальнай прасторы культуры.

Для паспяховай рэалізацыі навуковых даследаванняў у галіне гуманітарных навук варта актывізаваць дзейнасць міждысцыплінарных навукова-даследчых кластараў Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі. Плануецца прадоўжыць навуковае супрацоўніцтва з аналітычнымі цэнтрамі, універсітэтамі і навукова-даследчымі структурамі замежных краін, у першую чаргу Расійскай Федэрацыі і КНР.

З мэтай развіцця творчага і навуковага патэнцыялу моладзі, садзейнічання прафесійнаму росту, актывізацыі ўдзелу маладых вучоных у фундаментальных і прыкладных навуковых даследаваннях будзе актывізавана дзейнасць Маладых акадэмій, пашырана супрацоўніцтва з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь. Плануецца павялічыць колькасць філіялаў кафедр ВНУ у арганізацыях Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў.

**Вывады.** У сучасных умовах ідэалагічнага і інфармацыйнага супрацьстаяння галоўнай задачай гуманітарнай навукі з'яўляецца аб'ектыўнае асвятленне вопыту беларускага народа, паказ дасягненняў мінулага і сучаснасці. Неабходна ўмацаваць у свядомасці грамадзян ідэю аб тым, што гісторыя, мова, культура з'яўляюцца найважнейшымі ідэнтыфікацыйнымі маркерамі нацыі і дзяржаўнасці, а гістарычныя веды складаюць аснову фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і аб'яднання людзей у нацыю.

Вывучэнне механізмаў фарміравання і функцыянавання ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, сацыяльна-палітычных і духоўна-культурных працэсаў у сучасным беларускім грамадстве, навукова-тэарэтычных праблем і філасофска-светапоглядных перадумоў сацыяльнага прагрэсу будзе садзейнічаць захаванню гуманітарнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2021 года / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў. – Мінск: Беларус. навука, 2022. – 221 с.

2. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2022 года / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў. – Мінск: Беларус. навука, 2023. – 240 с.

3. Акадэмічная гуманітарыстыка: важнейшыя вынікі 2023 года / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў. – Мінск: Беларус. навука, 2024. – 226 с.

4. Летопись – память белорусского народа. – URL: https://belletapis.by/ (дата обращения: 28.11.2024).

5. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя: у 10 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004–2021. – 10 т.

6. Гістарычны слоўнік беларускай мовы: інфарм.-давед. вып. / [Н. В. Паляшчук і інш.]; рэдкал.: Н. В. Паляшчук (адк. рэд.), Э. В. Ярмоленка, С. М. Макітрук. – Мінск: Беларус. навука, 2022. – 273 с.

7. Гістарычны слоўнік беларускай мовы: у 37 вып. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства; пад рэд. А. М. Булыкі, А. І. Жураўскага. – Мінск: Беларус. навука, 1982–2017. – 37 вып.

8. Русско-белорусский системный семантический словарь: в 2 т. / НАН Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, яз. и лит., Ин-т языкознания. – Минск: Беларус. навука, 2023. – 2 т.

9. Слоўнік беларускай мовы / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства; навук. рэд. В. П. Русак. – Мінск: Беларус. навука, 2024. – 914 с.

10. Граматычны слоўнік дзеяслова: А – Я / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства; уклад.: В. П. Русак [і інш.]; навук. рэд. В. П. Русак. – Мінск: Беларус. навука, 2024. – 1151 с.

11. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: аналіт. і давед.-інфарм. матэрыялы / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства. – Мінск: Беларус. навука, 2024. – 573 с.

12. Социокультурные практики населения Беларуси в условиях цифровой трансформации / Д. К. Безнюк [и др.]; науч. ред. Д. К. Безнюк. – Минск: Беларус. навука, 2022. – 195 с.

13. Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія / Т. В. Валодзіна [і інш.]; уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько. – Мінск: Беларус. навука, 2021. – 481 с.

14. Традыцыйны светалад беларусаў: у 5 іл. кн. / НАН Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2023. – Кн. 1: Касмалогія / уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько; аўт. тэкстаў: Т. В. Валодзіна [і інш.]. – 85 с.

15. Традыцыйны светалад беларусаў: у 5 іл. кн. / НАН Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2023. – Кн. 2: Сфера сакральнага. Народная тэалогія / уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько; аўт. тэкстаў: Т. В. Валодзіна [і інш.]. – 92 с.

16. Традыцыйны светалад беларусаў: у 5 іл. кн. / НАН Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2024. – Кн. 3: Чалавек / уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько; аўт. тэкстаў: Т. В. Валодзіна [і інш.]. – 97 с.

17. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. / НАН Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2008–2017. – Т. 1–4.

18. Беларуская энцыклапедыя. – URL: https://belarus.belarusenc.by/ (дата обращения: 28.11.2024).

## References

1. *Academic humanitarian science: the most important results of 2021.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2022. 221 p. (in Belarusian).

2. *Academic humanitarian science: the most important results of 2022.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2023. 240 p. (in Belarusian).

3. *Academic humanitarian science: the most important results of 2023.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 226 p. (in Belarusian).

4. *Chronicle – the memory of the Belarusian people.* Available at: https://belletapis.by/ (accessed 28.11.2024) (in Russian).

5. *Towns and villages of Belarus: in 10 vol.* Minsk, Belaruskaya Entsyklapedyya Publ., 2004–2021. 10 vol. (in Belarusian).

6. Palyashchuk N. V., Yarmolenka E. V., Makitruk S. M. (eds.). *The Historical dictionary of the Belarusian language: information and reference edition.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 273 p. (in Belarusian).

7. Bulyka A. M., Zhurauski A. I. (eds.). *The historical dictionary of the Belarusian language.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 1982–2017. 37 vol. (in Belarusian).

8. *Russian-Belarusian sistem semantic dictionary: in 2 vol.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2023. 2 vol. (in Russian).

9. Rusak V. P. (ed.). *Dictionary of the Belarusian literary language.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 914 p. (in Belarusian).

10. Rusak V. P. (ed.). *The Grammatical dictionary of the verb: A – Z.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 1151 p. (in Belarusian).

11. *Lexical atlas of Belarusian folk speeches: analytical and reference materials.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 573 p. (in Belarusian).

12. Beznyuk D. K. (ed.). *Sociocultural practices of the population of Belarus in the context of digital transformation.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 195 p. (in Russian).

13. Dubyanetskaya I. M., San'ko S. I. (eds.). *A little closer to the Sun, a little further from the Moon: Belarusian folk philosophy.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2021. 481 p. (in Belarusian).

14. Dubyanetskaya I. M., San'ko S. I. (eds.). *Traditional worldview of belarusians. Vol. 1. Cosmology.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2023. 85 p. (in Belarusian).

15. Dubyanetskaya I. M., San'ko S. I. (eds.). *Traditional worldview of belarusians. Vol. 2. Sphere of the sacred. Folk Theology.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2023. 92 p. (in Belarusian).

16. Dubyanetskaya I. M., San'ko S. I. (eds.). *Traditional worldview of belarusians. Vol. 3. Human being.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2024. 97 p. (in Belarusian).

17. *The History of Philosophical and socio-political thought of Belarus: in 6 vol.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2008–2017. 1–4 vol. (in Belarusian).

18. *Belarusian encyclopedia.* Available at: https://belarus.belarusenc.by/ (accessed 28.11.2024) (in Belarusian).

## Информация об авторах

**Коваленя Александр Александрович** – академик, доктор исторических наук, профессор, академик-секретарь. Отделение гуманитарных наук и искусств, Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: humanity@presidium.bas-net.by

**Левкович Василий Иванович** – кандидат философских наук, заместитель академика-секретаря. Отделение гуманитарных наук и искусств, Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: humanity@presidium.bas-net.by

**Юшкевич Ольга Сергеевна** – кандидат филологических наук, ученый секретарь. Отделение гуманитарных наук и искусств, Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: okuh@mail.ru

## Information about the authors

**Aliaksandr A. Kavalenia** – Academician, D. Sc. (Hist.), Professor. Academic secretary of the Department of Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: humanity@presidium.bas-net.by

**Vasili I. Liaukovich** – Ph. D. (Philos.). Deputy academic secretary of the Department of Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: humanity@presidium.bas-net.by

**Volha S. Yushkevich** – Ph. D. (Philol.). Scientific secretary of the Department of Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: okuh@mail.ru